БУДЗЬ У КУРСЕ!

## НЕРАЎНАДУШНЫЯ — ЗА «ЧЫСТЫ ВАДАЁМ»

**Акцыя пад такой назвай пройдзе ў краіне з 27 красавіка па 4 мая. Яе з 2014 года традыцыйна праводзіць рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Далучыцца да мерапрыемства могуць усе ахвотныя.**

За гэты час сіламі супрацоўнікаў БТПР разам з прадстаўнікамі іншых арганізацый, а таксама нераўнадушных грамадзян прыведзена ў парадак больш за тры тысячы кіламетраў берагавой лініі вадаёмаў і вадацёкаў краіны. У акцыі бралі ўдзел звыш 25 тысяч чалавек, было сабрана каля чатырох тысяч кубаметраў смецця, якое вывезена на палігоны цвёрдых бытавых адходаў.

Акцыя ў першую чаргу скіраваная на экалагічнае выхаванне ўсіх слаёў насельніцтва, прыцягненне ўвагі да праблемы забруджвання вадаёмаў, а таксама на прывядзенне ў належны стан прыбярэжнай зоны вадаёмаў і вадацёкаў напярэдадні масавага актыўнага адпачынку на прыродзе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## 15 тысяч дрэў за некалькі гадзін

**Лес «Юнацтва» з'явіўся 19 красавіка ў Рэчыцкім раёне. Цімураўцы Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі, валанцёры руху «Добрае сэрца» і ўдзельнікі студатрадаўскага руху Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі каля вёскі Аляксандраўка за некалькі гадзін высадзілі 15 тысяч дрэў.**

Маладыя людзі будуць сачыць і за тым, як набіраюць сілу высаджаныя імі на плошчы 3 га хвоі і бярозы. Пасадачны матэрыял для дзяцей выдзеліў Рэчыцкі лясгас. Дасведчаныя лесаводы расказалі ім пра прыродны патэнцыял беларускіх лясоў і барацьбу з караедам, якая праводзіцца на Гомельшчыне. Акцыя стала адным з мерапрыемстваў, прымеркаваных да рэспубліканскага Тыдня лесу. Акрамя таго, моладзь рэгіёна прымае актыўны ўдзел у навядзенні парадку на зямлі — каля вадаёмаў, на вуліцах, у дварах, скверах і парках населеных пунктаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЗДАРЭННІ

## ГОРА ДЛЯ ЎСЁЙ ВЁСКІ

**Як паведамілі ў абласным упраўленні МНС, у адну з начэй у вёсцы Камень Пінскага раёна ў агні загінулі муж і жонка.**

Карэспандэнт газеты звязалася са **старшынёй Загародскага сельскага Савета Аленай БАГАТКАЙ.** Алена Іванаўна расказала, што ранкам каля хаты плакала ўся вёска. Раіса і Васіль Завадскія былі ў ліку самых аўтарытэтных людзей Каменя. Раіса Аляксандраўна ва ўзросце 67 гадоў яшчэ працавала сацыяльным работнікам, дапамагала старым, адзінокім людзям. Яна была сапраўднай маці Тэрэзай для вёскі, бо заўсёды дапамагала і тым, хто не знаходзіўся ў яе на абслугоўванні. Усе ўжо прывыклі, што Раіса Аляксандраўна магла зайсці да нямоглага, прынесці яму свежага супчыку, прыбраць злёгку, забраць дадому бялізну, каб памыць. Яе любілі і за тое, што за жыццё ні з кім не пасварылася, нікога не асудзіла, толькі добрую параду магла даць, добрым словам суцешыць.

Суседзі ведаюць, што напярэдадні ў гаспадароў былі праблемы з электрычнасцю і яны выклікалі спецыялістаў. Потым паведамілі дзецям, што ўсё адрамантавана. Чацвёра дзяцей Завадскіх жывуць у Брэсце і Пінску. Ім зараз спачувае ўся вёска.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВЫ ЧАС

# ГАРАЖЫ-МІРАЖЫ

**Нядаўна знаёмы падзяліўся праблемай:**
**— Купіў аўтамабіль, а гаража няма. А тут падвярнуўся выпадак — сусед-пенсіянер прадае свой гараж, што за бальніцай. Цана мяне задавальняе, але ёсць адна закавыка: ніякіх дакументаў на пабудову няма. Што рабіць? Ці не адбяруць пасля ў мяне той гараж?**



Правеўшы невялікае журналісцкае расследаванне, ужо праз некалькі дзён пераканаўся: на Уздзеншчыне афіцыйных дакументаў на права валодання гаражамі не маюць каля дзвюх сотняў іх уладальнікаў, у гаражных масівах, што ў раёне бальніцы і магазіна «Еўраопт».

Легкавы аўтамабіль перастаў быць раскошай і стаў незаменным атрыбутам. Зніклі чэргі на яго набыццё, айчынны рынак напоўнілі прадстаўнікі не толькі расійскага аўтапрама, але і шэрагу іншых, еўрапейскіх і азіяцкіх, краін. Вось і Узду запаланілі аўто прасцейшых і больш прэстыжных марак. Хто меў свой прысядзібны ўчастак, ставіў машыну ў надворнай пабудове. Жыхары ж шматкватэрных дамоў — каля пад'ездаў. Потым гарадскія ўлады выдзелілі для будаўніцтва індывідуальных гаражоў невялікі ўчастак на тагачаснай ускраіне райцэнтра, недалёка ад цяперашняга «Еўраопта». Гэтую пляцоўку, дзе размясціліся 90 гаражоў, за некалькі гадоў запоўнілі-забудавалі.

У канцы 1980-х рашэннем мясцовай улады выдзяляецца новы ўчастак для гаражоў, паблізу Водаканала. Гэтым разам пад іх адвялі большую плошчу, бо ахвотных атрымаць дах для сваіх чатырохколавых памочнікаў было шмат. Афіцыйных дакументаў аб утварэнні гаражнага кааператыва адшукаць не ўдалося, але фактам застаецца тое, што ён існаваў. На той час, пэўна, не патрабавалася такой колькасці прававых актаў і юрыдычных фармальнасцяў.

На працягу некалькіх гадоў рэгістрацыяй новых уладальнікаў машын і ахвотных мець гараж, зборам узносаў, выдзяленнем пустуючых участкаў займаліся тагачасныя старшыня райкама прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі і кіраўнік землеўпарадкавальнай службы. Час ад часу ўладальнікі гаражоў скідваліся па тры—сем рублёў для выканання пэўных гаспадарчых работ: расчысткі пад'езду да гаражоў ад снегу, грэйдзіравання дарогі, санітарнай уборкі тэрыторыі. Ладзілі і суботнікі. Меліся планы сабраць грошы і ўладкаваць электрычнае асвятленне, але калі падлічылі магчымыя агульныя затраты, то ад задумы адмовіліся.

Ішоў час. Паступова ўдасканальвалася прававая база ў многіх сферах жыцця. Высветлілася, што многія ўладальнікі названых вышэй гаражоў у райцэнтры, а таксама ў аграгарадку Хатляны і ў некаторых іншых населеных пунктах Уздзеншчыны не маюць на руках афіцыйных дакументаў на права валодання нерухомай маёмасцю.

**Юрысты сведчаць: нельга лічыць дакументамі выдадзеныя ў 80—90-я гады мінулага стагоддзя не існуючым сёння пасялковым Саветам дэпутатаў выпіскі з рашэння выканкама аб выдзяленні зямельнага ўчастка.**

— Часткай 2 артыкула 7 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена непахіснае правіла ў адносінах да любой нерухомай маёмасці, — тлумачыць **загадчык Уздзенскага бюро Дзяржынскага філіяла РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» Максім ШОБІК.** — Права на маёмасць узнікае толькі з моманту рэгістрацыі гэтай маёмасці ці адпаведных правоў на яе. На жаль, нягледзячы на тое, што ў горадзе Узда і раёне існуе нямала такіх гаражоў, юрыдычныя правы на іх людзі законным чынам так і не зарэгістравалі.

Якія адсюль вывады? Такія гаражы нельга падарыць, перадаць у спадчыну, прадаць. Так, некаторыя негалосна перадаюцца ў карыстанне ад бацькі сыну, суседу, знаёмаму, нават прадаюцца — «пад распіску» за пэўную суму, але калі новы ўладальнік паспрабуе зарэгістраваць такі гараж, здзелка не будзе лічыцца законнай.

Якое выйсце з сітуацыі?

— Уладальнікі гаражоў павінны стварыць і афіцыйна зарэгістраваць юрыдычную асобу — гаражны кааператыў, — падказвае алгарытм дзеянняў Максім Шобік. — Абраны на агульным сходзе старшыня кааператыва звяртаецца ў райвыканкам для выдзялення зямельнага ўчастка пад ўвесь гаражны масіў. Пасля рэгістрацыі ўчастка спецыялісты нашага бюро ці іншай арганізацыі, якая мае адпаведную ліцэнзію на выкананне такіх работ, праводзяць тэхнічную інвентарызацыю масіву і кожнага з гаражоў, у які будзе забяспечаны доступ. І толькі пасля гэтага ўладальнікі гаражоў могуць звяртацца да нас ці ў іншую ўстанову для афармлення тэхнічнага пашпарта, які і будзе законным дакументам на права валодання пабудовай.

Падобную работу не раз спрабавалі арганізаваць, але да лагічнага завяршэння так і не дайшло. У 2000 годзе ва Уздзенскім райвыканкаме быў зарэгістраваны гаражны кааператыў «Сваё аўто», яго кіраўніком абралі Сяргея Салаўёва. Кааператыў стаў юрыдычнай асобай, адкрылі яго разліковы рахунак у Беларусбанку. На працягу некалькіх гадоў неадназова праводзіліся агульныя сходы, дзе членам кааператыва, новым ахвотным займець дах над сваім аўтамабілем тлумачылі іх правы і абавязкі.

Але нярэдка на такія сходы са 176 маючых гаражы прыходзілі ўсяго па 30—40 чалавек. (На чаргу маючых патрэбу ў гаражах пастаўлена яшчэ каля 100 ахвотных.) Некаторыя са «старажылаў» адмаўляюцца прыходзіць на сходы з той прычыны, што лічаць законным дакументам старую выпіску з пасяджэння пассавета аб выдзяленні ўчастка. Паводзінамі некаторых кіруюць уласныя амбіцыі. А многіх задавальняе існуючая сітуацыя: гараж ёсць, прадаваць ці дарыць яго мы не збіраемся...

Кааператыў «Сваё аўто» ў свой час звяртаўся ў землеўпарадкавальную службу райвыканкама. Аднак справу гэтую да канца не давялі, участак так і не зарэгістравалі.

Потым на працягу некалькіх гадоў работай гаражнага кааператыва займаліся спецыялісты юрыдычнай, землеўпарадкавальнай службаў райвыканкама. Усё цяжэй было сабраць людзей на сход, а тым больш — для ўнясення чаргова ўзносу для выканання той ці іншай работы.

Сёння неабходна зноў арганізаваць работу па афармленні і рэгістрацыі землеўпарадкавальнай справы. А для гэтага павінны прыйсці ў райвыканкам тыя члены кааператыва, якія нібыта маюць нейкія дакументы на гараж, напісаць заяву аб фармальнай адмове ад яго і афармленні новых дакументаў. Без сустрэчы з кожным уладальнікам гаража цяжка давесці справу да канца...

**Віктар САБАЛЕЎСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 26 красавіка 2018 года.**